Культура

26.05.2018

# “Джаконда”, да канца не спазнаная

**Эмануіл ІОФЕ, прафесар БДПУ, доктар гістарычных навук**

Гэтай жанчыны няма на свеце ўжо больш за 20 гадоў, але яе вобраз — нібы і цяпер перад вачыма. Ніна Барысаўна Ватацы ўвайшла ў гісторыю беларускай культуры як адна з пачынальнікаў нацыянальнай бібліяграфіі, багдановічазнаўца № 1, ініцыятар стварэння, адзін з арганізатараў і дарадца Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Яна працавала ў галоўнай бібліятэцы Беларусі больш за паўстагоддзя. Цяжка нават уявіць, што адзін спецыяліст мог падрыхтаваць 23 бібліяграфічныя даведнікі па творчасці беларускіх пісьменнікаў!



Ніна Ватацы.





Яе жыццёвы шлях пачаўся 14 мая 1908 года ў горадзе Вендэне Ліфляндскай губерні (цяпер гэта латвійскі Цэсіс). Потым быў пераезд у Мінск. У 1927 — 1930 гадах Ніна Ватацы вучылася на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ. Па сканчэнні яе накіравалі на працу ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя Леніна.

Яе дырэктар Іосіф Сіманоўскі ўжо тады прадбачыў будучыя здольнасці маладой дзяўчыны, скіраваўшы ў аддзел беларускай бібліяграфіі. Прыцягнуў здольную маладую супрацоўніцу да ўдзелу ў часопісе “Кніга — масам”, у якім у 1932 годзе быў надрукаваны яе першы артыкул, прысвечаны афармленню кніг. Працавітасць і дапытлівасць, уседлівасць і, калі хочаце, талент бібліяфіла — вось тое, што дапамагло Ніне Ватацы за пяць гадоў прайсці шлях ад памочніцы бібліятэкара да старшага бібліятэкара-бібліёграфа.

Разам са старэйшымі бібліёграфамі Юліяй Бібілай і Фаняй Мільчынай, Ніна Барысаўна склала поўны каталог беларускай літаратуры. Трэба было прачытаць літаральна ўсе кнігі, што выдаюцца ў Беларусі, а таксама і ўсё, што было напісана пра беларускую літаратуру ў Савецкім Саюзе і за яго межамі. Бібліёграф павінен ведаць кожны твор, фіксаваць усе рэцэнзіі, складаць анатацыі, картатэкі, каталогі. І гэтая сціплая і руплівая праца яе задавальняла.

## Кніга як лекі ад ранаў

Вялікая Айчынная вайна заспела Ніну Барысаўну ў горадзе Ульянаўску, дзе яна працавала ў педвучылішчы. У 1942 годзе на фронце загінуў яе муж Аляксандр Саўчанка. Але перажыўшы трагедыю, яна знайшла ў сабе сілы і мужнасць вярнуцца да любімай справы.

У 1942 — 1945 гадах Ніна Ватацы загадвала бібліятэкай эвакуацыйнага шпіталя ў горадзе Мелекесе Ульянаўскай вобласці. І яшчэ раз пераканалася, якую важную ролю адыгрывае кніга ў жыцці чалавека. Ніна Барысаўна бачыла, як яна дапамагала параненым чырвонаармейцам адкінуць свае цяжкія думкі, пераадолець боль. Бібліятэкарку заўсёды чакалі з нецярплівасцю: адзін прасіў прынесці новы том, другі, зусім кволы — пачытаць услых, трэці — дапамагчы напісаць ліст родным… І для кожнага Ніна Ватацы знаходзіла патрэбнае слова, кожнага магла суцешыць і падтрымаць.

У 1945 годзе, суправаджаючы аднаго з параненых, Ніна Ватацы зноў прыехала ў Мінск. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў аднаўляліся фабрыкі, заводы, разнастайныя ўстановы. Спакваля ажывала і “Ленінка”. Ніне Барысаўне прапанавалі вярнуцца на ранейшае месца работы. У размове з аўтарам гэтых радкоў яна згадвала:

— Унутры было брудна, і мы доўга прыводзілі ўсё ў парадак. Кніг засталося мала: амаль усё вывезлі ў Германію. Неўзабаве сёе-тое ўдалося вярнуць. Разбіралі, сістэматызавалі, “лячылі” іх… Аднаўлялі каталогі і картатэкі. Было халодна, галодна, але ўсе мы былі шчаслівыя тым, што зноў можам прыносіць людзям радасць сустрэчы з кнігай.

## Жывая энцыклапедыя

Амаль ва ўсіх энцыклапедыях і даведніках сцвярджаецца, што з 1945 года Ніна Ватацы працавала на пасадзе галоўнага бібліёграфа аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі “Ленінкі”. На самой справе, гэта не зусім дакладна. Загадчык сектара абслугоўвання спецыялізаваных калекцый Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Яўгенія Галіеўская ўстанавіла, што згодна з загадам ад 18 жніўня 1945 года Ніна Ватыцы была залічана галоўным бібліятэкарам. З 1945 па 1948 год яна выконвала абавязкі загадчыка беларускага аддзела. А на пасаду галоўнага бібліёграфа Ніна Ватацы перайшла толькі ў 1952 годзе.

У тым самым годзе спачатку ў Мінску, а затым у Маскве быў выдадзены яе першы кароткі бібліяграфічны паказальнік, прысвечаны Якубу Коласу. У наступным годзе выйшаў і даведнік “Янка Купала”. А затым персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі, складзеныя Нінай Ватацы, з’яўляліся адзін за адным.

Імёны аўтараў, нумары, лічбы — вось, бадай, і ўвесь іх змест. Але колькі карпатлівай працы хавалася за кожным радком! Бібліёграф выявіла і сістэматызавала ўсе публікацыі пісьменнікаў і крытычныя водгукі на іх творы. А да ўсяго, пісала да сваіх выданняў грунтоўныя прадмовы, дзе нярэдка з’яўляліся невядомыя нават даследчыкам факты.

Дый што там! Здаралася, нават самі пісьменнікі звярталіся да Ніны Барысаўны, каб аднавіць у памяці звесткі пра тыя ці іншыя свае публікацыі! Балазе, памяць у яе была проста фенаменальная.

Ніна Ватацы дбайна вывучала творчыя набыткі дзясяткаў творцаў — і класікаў, і сучаснікаў. Але невыпадкова асаблівае месца ў яе спадчыне займае бібліяграфічны паказальнік “Максім Багдановіч” (1977), у якім зарэгістравана літаральна ўсё, напісанае паэтам і пра паэта да моманту выдання кнігі. А таксама — кожны з багдановічавых аўтографаў.

Шматгадовы даробак Ніны Барысаўны ў даследаванні жыцця і творчасці Багдановіча нават цяжка перааацаніць. Дзякуючы сваёй руплівасці ды інтуіцыі, яна не раз уводзіла ў навуковы ўжытак невядомыя раней творы, дакументы, фатаграфіі… Усё гэта лягло ў падмурак адкрыцця музея ў гонар паэта. Той дзень у снежні 1991 года стаў для яе сапраўдным святам.

Зрэшты, Ніна Ватацы ў сваёй працы дбала не толькі пра літаратуразнаўцаў-прафесіяналаў. У 1946 — 1956 гадах яна па сумяшчальніцтве выкладала на бібліятэчным факультэце Мінскага педінстытута, прымаючы непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы кадраў для соцень кніжніц. Многія яе вучаніцы — у ліку якіх і вядомая паэтка Вера Вярба — нават праз гады з удзячнасцю згадвалі выкладчыцу.

У тыя часы бібліятэкары з усіх куткоў БССР патрабавалі метадычную дапамогу. Менавіта ім адрасавалася кніга “Беларуская літаратура і работа з ёю ў масавых бібліятэках”(1958). Гэта быў першы ў БССР дапаможнік, які ўсебакова і глыбока асвятляў пытанні папулярызацыі мастацкай літаратуры.

Ветэраны бібліятэчнай справы, з якімі даводзілася гутарыць аўтару гэтых радкоў, добрым словам згадваюць і падрыхтаваныя Нінай Ватацы даведнікі “Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі” (1962) і “Беларуская савецкая драматургія” (1966). Апошні ўлічваў 552 драматургічныя творы і літаратуру аб іх за 1917 — 1965 гады — у тым ліку і кароткія зацемкі, якія друкаваліся ў газетах. Адметнай рысай даведніка стала і ўключэнне ў яго ненадрукаваных драматургічных твораў, якія, аднак, былі пастаўлены тэатрамі і разглядаліся крытыкай.

Праз 27 гадоў — у 1993-м — выйшаў новы бібліяграфічны даведнік Ніны Ватацы “Беларуская драматургія”. Там была змешчана інфармацыя ўжо пра 931 твор, апублікаваны, пастаўлены або прарэцэнзаваны за перыяд 1966 — 1986 гадоў.

У 1964 годзе па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле Ніны Ватацы быў створаны спецыяльны бібліяграфічны паказальнік “Беларускае літаратуразнаўства і крытыка (1945 — 1963)”. У 1986-м годзе Ніна Барысаўна прыняла ўдзел у рэдагаванні зводнага каталога “Кніга Беларусі, 1517 — 1917”.

## Густ інтэлігентнай гаспадыні

Што вельмі важна, прафесійныя якасці дапаўняліся ў гэтай асобе чалавечымі. Далікатнасць, уважлівасць, заўсёдная абаяльнасць… Тыя, каму пашчасціла ведаць Ніну Барысаўну, параўноўвалі яе інтэлігентную ўсмешку з усмешкай Джаконды.

“Яна была падобна да сонейка і любіла жыццё, людзей. Да яе прыбалтыйскага прозвішча Ватацы (дзявочага) і ўсяго лёгкага, “сонечнага” характару вельмі пасавалі заўсёды раздзеленыя на просты прабор чорныя валасы, — згадвае ў сваім артыкуле яе маладзейшая калега Людміла Сільнова. — У дзявоцтве яна насіла доўгія чорныя косы-змеі — звычайна, як мы бачылі на здымках, дзве; пасталеўшы, лавіла і ўтаймоўвала іх ззаду заколкамі. Валасы да глыбокай старасці былі натуральна чорныя, як глыбіні мора. Такой і запомнілася яна нам: на галаве, як адмеціна звыш, белая рыска-руна, падобная да месяцовай дарожкі на цёмнай вадзе. Заўсёды ветлівая ўсмешка, з якой яна звярталася да вас, была вам падарункам і ўзорам па-сапраўднаму інтэлігентных зносін, што асабліва стала каштоўным у крызісныя часы галоснасці, перабудовы і разбурэння былых культурных каштоўнасцей. Гэта лёгкая, светлая (да глыбокай старасці белазубая!) усмешка чалавека з доўгім, часам драматычным, а часам зайздросным лёсам нагадвала

мне птушку — сімвал акультуранага паветра і дакранання, а таксама сімвал мудрасці, інтэлекту і хуткасці думкі. Усё гэта ў асобе Ніны Барысаўны і было вызначальным! (…) Такой яна і засталася ў памяці калег і маёй. Арыстакратычная і адначасова дэмакратычная, адкрытая сэрцам насустрач людзям. Таямнічая, да канца не спазнаная”.

Аўтар гэтых радкоў неаднаразова сустракаўся з Нінай Барысаўнай і з удзячнасцю ўспамінае высакародства душы і маральныя якасці гэтага чалавека, усё жыццё якога было прасякнутае думкай — як лепш дапамагчы людзям. Асабліва часта нам даводзілася бачыцца ў 1969 — 1973 гадах, калі я быў аспірантам-завочнікам Інстытута гісторыі АН БССР і пісаў кандыдацкую дысертацыю пра жыццё і творчасць першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты. Справа ў тым, што ў 1927 — 1930-х гадах Ніна Ватацы слухала яго лекцыі і неаднаразова сустракалася з ім па розных справах. І кожны раз мяне здзіўляла эрудыцыя галоўнага бібліёграфа, яе такт і далікатнасць.

Менавіта тады Ніна Барысаўна пазнаёміла мяне са сваёй даволі складанай гаспадаркай. У аддзеле беларускай літаратуры і бібліяграфіі было звыш 270 тысяч кніг. Кожны дзень супрацоўнікі абслугоўвалі прыкладна 150 — 200 чалавек. Сярод іх — пісьменнікі, журналісты, вучоныя, аспіранты. Наплыў тады быў несупынны.

“Яна старалася ў кожным чалавеку разглядзець тое добрае, што вылучала яго сярод іншых, — згадвае пра Ніну Ватацы Яўгенія Галіеўская. — Была вялікім аптымістам. Гэтыя рысы характару вельмі адметныя для Ніны Барысаўны, таму да яе цягнуліся людзі… У доме беларускага бібліёграфа, літаратуразнаўцы Ватацы заўсёды былі парадак і чысціня. Ва ўсім адчуваўся густ інтэлігентнай гаспадыні”.

У адной з нашых размоў Ніна Барысаўна шчыра прызналася:

— Кніга ў маім жыцці — гэта ўсё. Яна дала мне адукацыю. Яна дапамагла мне набыць прафесію, якой я ганаруся і, нарэшце, яна навучыла мяне глыбока любіць людзей.

Ніны Барысаўны не стала 3 жніўня 1997-га на 90-м годзе жыцця. Перакананы, што ўклад заслужанага дзеяча культуры Беларусі Ніны Барысаўны Ватацы ў развіццё беларускай бібліяграфіі і літаратуразнаўства дастойны таго, каб яе імя было ўвекавечана ў горадзе Мінску, дзе яна плённа працавала больш за паўстагоддзе.